# НОВЫЯ ФОРМЫ ПРАЦЫ З ПРЫКАЗКАМІ І ПРЫМАЎКАМІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Савіч Юлія Юр’еўна
"Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина"

Нацыянальная адукацыйная сістэма павінна адрадзіць страчаныя духоўныя каштоўнасці беларускага народа. Беларусы па праву могуць ганарыцца сваёй мовай, звычаямі, традыцыямі, дасягненнямі. Таму настаўнікам пачатковых класаў неабходна звяртацца да каштоўнасцей, захаваных беларускай народнай педагогікай.

Мудрасць народа зафіксавана, у прыватнасці, у прымаўках і прыказках, свайго роду скарбонках жыццёвага вопыту пакаленняў. Яны з даўніх часоў прысутнічаюць ў практыцы перадавых педагогаў, што карысталіся дыяментамі народнага розуму, уключалі іх ў свае кнігі. Вядома, што ўвядзенне народна-педагагічнай спадчыны ў вучэбна-выхаваўчы і адукацыйны працэс пачатковай школы садзейнічае актывізацыі дзяцей, пывышэнню ўвагі, развівае мову і мысленне, дапамагае вырашэнню выхаваўчых задач, спрыяе нацыянальнай ідэнтыфікацыі навучэнцаў. Таму патрэбна імкнуцца да рэалізацыі найбольшага спектра работ з прыказкамі і прымаўкамі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання не толькі ў старэйшых, але і ў пачатковых класах.

У пачатковых класах праца з прыказкамі зводзіцца да актыўнага знаёмства вучняў з гэтымі выслоўямі і да іх завучвання. Акрамя гэтага, настаўнік павінен навучыць малодшых школьнікаў раскрываць сэнс прыказак, умець іх выкарыстоўваць у сваім маўленні. Зразумець сэнс прыказкі – значыць, раскрыць абагульнена-метафарычны вобраз, закладзены ў ёй, канкрэтызаваць, растлумачыць яго, выкарыстоўваючы для гэтага чытацкі і жыццёвы вопыт школьнікаў. На ўроках літаратурнага чытання прыказкі дапамагаюць выразіць у сціслай форме мараль, павучанне, сфарміраваць галоўную думку прачытанага твора.

На ўроках літаратурнага чытання можна выкарыстоўваць наступныя заданні: падкрэсліце з прапанаваных прыказак дзве прыказкі, аб’яднаныя агульнай тэмай; падкрэсліце словы ці словазлучэнні, якія з’яўляюцца галоўнымі для разумення сэнсу прыказак; да ілюстрацыі знайдзіце некалькі прыказак, якія раскрываюць сэнс эпізода; разгадайце крыжаванку, да ключавога слова падбярыце прыказку; імправізацыя прыказак;

напішыце сачыненне па прыказцы; падбярыце прыказкі, якія найбольш ярка характарызуюць таго ці іншага героя твора; складзіце план мастацкага твора з выкарыстаннем прыказак і інш.

Прыказкі даюць багаты матэрыял для працы над словам. Створаныя на працягу стагоддзяў, прыказкі захоўваюць словы, якія сёння ўжо выйшлі з ужытку ці маюць абмежаванае распаўсюджанне. Калі настаўнік не зверне ўвагі на такія словы, не патлумачыць іх значэння, то вучні няправільна зразумеюць ці зусім не разумеюць сэнс прыказкі.

Для развіцця творчых здольнасцяў вучняў пачатковых класаў настаўнік можа прапанаваць наступныя гульні.

***«Знайдзі пару».*** Вучні падзяляюцца на дзве каманды, кожная з якіх атрымлівае набор картак. На адных картках змешчаны пачатак прыказак (прымавак), на другіх – іх канцоўка. За тры хвіліны кожная каманда павінна падабраць карткі так, каб можна было прачытаць тэкст цалкам.

*Рыбам – мора, птушкам – паветра, ... (... а чалавеку – Айчына).*

*Лепш сініца ў руках, ... (... чым журавель у небе).*

*Аб тым зязюля кукуе, ... (... што свайго гнязда не мае).*

*Той Бацькаўшчыну любіць, ... (... хто ей сумленна служыць).*

*Добра таго вучыць, ... (... хто хоча ведаць).*

*Птушка моцная крыламі,...(... а чалавек дружбай).*

*Той не можа быць другам, ... (... хто у бядзе абыдзе кругам).*

*Усюды добра, ... (... а дома лепей).*

*Сярод ваўкоў жыць – ... (... па-воўчы выць).*

*Чуе звон, ... (... ды не ведае, дзе ён).*

***«Падбяры слова».*** З двух бакоў дошкі прымацаваны палоскі, на якіх напісаны пачатак прыказак. Двое вучняў атрымліваюць карткі з назвамі птушак – гэта канцоўкі прыказак. Выйграе той, хто хутка і правільна размесціць карткі.

*Надзьмуўся як... сава.*

*Глядзіць як... сыч.*

*Натапырыўся як... верабей.*

*Насупіўся як... індык.*

*Сівы як... голуб.*

*Драчлiў як... певень.*

*Скача як... сарока.*

***«Назаві прыказкі».*** Двое вучняў па чарзе бяруць са стала карткі, на якіх запісаны словы ці спалучэнні слоў, зачытваюць іх і адразу ж называюць прыказку (прымаўку) з гэтымі словамі.

*... як птушка... . – Слова як птушка: выпусціў – не вернеш.*

*Кожны цыган... . – Кожны цыга сваю кабылу хваліць.*

*Любіш ездзіць... . – Любіш ездзіць, любі і саначкі вазіць.*

*Шыла.... – Шыла ў мяху не схаваеш.*

*... байкамі ... . – Салаўя байкамі не кормяць.*

***«Што гэта азначае?»*** Падзяліўшыся на каманды, вучні па чарзе падыходзяць да стала, бяруць карткі, чытаюць прыказку (прымаўку) і тлумачаць яе сэнс.

*За дурною галавою і нагам няма спакою.*

*У адно вуха ўпусціў, а ў другое – выпусціў.*

*Хто два зайцы гоніць, ніводнага не дагоніць.*

*Як мы да людзей, так і людзі да нас.*

*Падзякаю сыты не будзеш.*

*Не будзь ласы на чужыя каўбасы.*

*Лепш сто сяброў, чым сто рублёў.*

***Птушкі з «Р».*** Удзельнікі дзвюх каманд павінны ўзгадаць прыказкі знazвамі птушак. А ў назве птушкі павінна быць літара «Р». Пераможа тая каманда, якая ўспомніць больш прыказак ці прымавак за адну хвіліну.

*У багатай хаце і куры часцей нясуцца.*

*Быў бы куст, а варона знойдзецца.*

*Крумкач крумкачу вока не выдзеўбе.*

*На сваім сметніку і верабей гаспадар.*

*Паможа вароне мыла, як памерламу кадзіла.*

*Сядзіць як курыца на насесце.*

*Салавей месяц пяе, а ворона круглы год каркае.*

***«Знайдзі і растлумач».*** У настаўніка знаходзяцца карткі, на якіх запісаны дыялогі. У дыялогах ёсць прыказкі, якія вучні павінны знайсці ў тэксце і растлумачыць.

1. – Мама, хутчэй канчай прасаваць, пойдзем у грыбы, а то сцямнее. – *Спяшыць – людзей насмяшыць. Не глядзі, каб скора, а глядзі, каб добра.* Яшчэ паспеем і грыбоў назбіраць.

2. – Сёння ў нас у хаце *ні мукі пылінкі, ні солі драбінкі.*

– Я зараз, матуля, збегаю ў краму і ўсё, што трэба, куплю.

3. – Добры дзень вам! Як гадуецеся?

– А нічога. *Жывём, хлеб жуём!* А ты ці здаровы?

– Я *здаровы, як рыжок баровы.*

4. – Бабулька, ты казала, што мы пойдзем гуляць!

– Пойдзем, унучка, але скажы, ці памыла ты ўжо посуд?

– Я потым памыю.

– Не. *Адклад не ідзе ў лад.* Памый чысценька посуд, а тады і пойдзем.

5. – Пара, Алінка, пара абедаць. Мый рукі і сядай за стол.

– Мама, *абед – не заяц, у лес не ўцячэ.*

Трэба выкарыстоўваць і такія формы, як праца над разуменнем сэнса прыказак і прымавак; складанне апавядання па прыказцы; драматызацыя

прапанаванага апавядання па прыказцы; падбор прыказак да апавядання; аднаўленне прыказкі з пераблытаных слоў; складанне прыказкі па тэме; збор прыказак на адну тэму; чытанне прыказкі наадварот; аднаўленне прыказкі па малюнку; дапаўненне прыказкі па двух словах; знаходжанне прыказкі ці прымаўкі да малюнка; знаходжанне прыказкі ці прымаўкі з часцінай мовы, антонімамі, сінонімамі і г.д.; выдзяленне арфаграм; пісьмо з каменціраваннем; каліграфічная праца; складанне індывідуальных і агульнага зборнікаў прыказак і прымавак; маляванне па прыказцы ці прымаўцы; вусныя зрокавыя дыктоўкі і г.д.

Цікавая форма работы – падбор прыказак і прымавак да малюнка. Дзеці разглядаюць малюнак і ім прапануецца заданне ўспомніць як мага больш прыказак, у якіх ёсць азначаныя рэчы. Магчыма выкарыстанне адразу вялікага малюнка, калі звяртаецца ўвага на асобныя рэчы, альбо кожны малюнак прад’яўляецца паасобку.

Можна выкарастоўваць і такі варыянт працы з прыказкамі і прымаўкамі, які спрыяе развіццю мыслення і мовы, як прымаўка (прыказка) наадварот. Да кожнага слова падбіраецца сэнсавы антонім. Даволі складана, але як цікава! *(Дзе гора, там і роспач. – Дзе шчасце, там і радасць; Дрэннаму пасеву дрэнны і ўзыход. – Добраму ўраджаю добрая і ўборка)*.

Вучням патрэбна прапанаваць такі варыянт работы, калі яны павінны аднавіць прыказку па двух словах *(дзеясловах, назоўніках, прыметніках)*: птушка – дзеці *(Птушка рада вясне, а дзеці маці)*, галава – ногі *(Галава б не думала, ногі б не пайшлі)*.

Такім чынам, пастаянная праца з прыказкавым багаццем беларускай мовы спрыяе правільнаму ўжыванню малодшымі школьнікамі гэтых самацветаў роднай мовы ў маўленні. Дзеці вучацца дастасоўваць іх да розных жыццёвых сітуацый. Трэба імкнуцца да таго, каб родная мова гучала не толькі на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання, але і на перапынках, у пазакласных зносінах. Да прыказак і прымавак трэба звяртацца ў размовах, расповедах, гутарках, аналізе выпадкаў, паводзін, учынкаў.

Вопыт сведчыць, што калі разумна, рэгулярна, ненадакучліва выкарыстоўваць народную педагагічную мудрасць прыказак і прымавак, то эфектыўнасць як вучэбнага, так і выхаваўчага працэсу значна ўзрастае. Можна адзначыць, што ў дзяцей хутчэй і больш трывала фаміруюцца маральныя якасці, вучні становяцца больш уважлівыя да слова, узбагачаецца іх мова, развіваюцца творчыя здольнасці і праявы.